**Пакульніцкі Леанард**

**Як хлопчык з Едакланяў стаў вядомым беларускім скульптарам**

Тыя з астраўчан, каму даводзілася бываць у Мінску на плошчы Незалежнасці, напэўна, звярталі ўвагу на скульптуру ўзлятаючых з жытняга поля трох буслоў. Велічныя птахі расправілі крылы і, здаецца, вось-вось адарвуцца ад зямлі і закружаць над плошчай, над сталіцай, над усёй нашай краінай, асяняючы сваім клёкатам, як малітвай, родны край. І пры гэтым мала хто ведае, што аўтары гэтай кампазіцыі – ураджэнец Астравеччыны Леанард Пакульніцкі і яго жонка Алена Хараберуш.



*– Спачатку лепіш маленькую фігурку з мяккага матэрыялу – гліны ці пластыліну, затым – большую, яшчэ большую, у натуральную велічыню… Здымаецца форма, якая заліваецца воскам, затым – расплаўленым металам. Адлітую скульптуру трэба падпраўляць, чэканіць, бо заўсёды ёсць нейкія агрэхі. Словам, усё як у казцы пра лёгкі хлеб, – расказвае пра няпросты працэс стварэння скульптуры член Саюза мастакоў Леанард Пакульніцкі.*

Ад родных ніў, ад роднай хаты…
Леанард – родныя і сябры да гэтага часу завуць яго па-свойску Лёшам – родам з Едакланяў. Там заканчваў пачатковую школу, у сярэднюю пайшоў у Астравец, жыў у школьным інтэрнаце.
Адкуль у вясковага хлапчука ўзнікла цяга да мастацтва, сказаць цяжка. Бацька, патомны селянін, любіў жартаваць: «З паляўнічага ды музыкі хлеб невялікі». У вёсцы заўсёды галоўным здабыткам лічыліся зямля, жывёла, гаспадарка.
– Ды я і сам не ведаю, адкуль гэта ўзялося, – паціскае плячыма Леанард Іосіфавіч. – Пасля школы ўрокі зробіш – і малюеш ці лепіш нешта з гліны. Сябры партрэты свае хвалілі, казалі, што падобна. У школе мае здольнасці хутка заўважылі: усе сачыненне пішуць, а я

насценгазету ці плакаты малюю. А неяк убачыў скульптуры Азгура – і так мне спадабалася. Стала цікава: а я сам – ці змог бы нешта такое зрабіць? Па малюнку паспрабаваў вылепіць невялікі бюст Леніна. Прынёс у школу – ацанілі. Пасля таго і вырашыў Леанард паступаць у тэатральна-мастацкі інстытут. Многія лічылі гэта дзівацтвам: што за прафесія такая – галовы з гліны ляпіць? Хіба ж з гэтага пражывеш? Гэта ж не ніву араць… Дый куды нам, з вёскі, «у лапцях»?! Такія вучэльні – для гарадскіх, туды ж, пэўна, толькі з блатам і можна паступіць. Але да таго часу ў тэатральна-мастацкім інстытуце на факультэце графікі ўжо вучыўся астраўчанін Віктар Александровіч – і ўсе ведалі, што ніякіх «плячэй», акрамя таленту, у яго няма. Вось і вырашылі трое астравецкіх хлопцаў – Алег Драбышэўскі, Аляксандр Харытонаў і Леанард Пакульніцкі – пайсці па пратораным Віктарам шляху: паступаць на мастакоў. Двое першых выбралі жывапіс, а Лёша – скульптуру. Удача ў той год усміхнулася толькі яму. Бацька, які лічыў, што «з музыкі хлеб невялікі», крыжам ляжаў перад абразамі, аддаючы падзяку Богу за сына, які атрымаў нечаканы, немагчымы шанс выбіцца ў людзі.

## Сустрэча

Курс у тым годзе набіраў народны мастак БССР, прафесар Андрэй Ануфрыевіч Бембель, легендарны беларускі скульптар. Пазней ён перадаў яго не менш таленавітаму народнаму мастаку БССР і прафесару, вядомаму далёка за межамі Беларусі Анатолю Аляксандравічу Анікейчыку. У такіх выкладчыкаў немагчыма не стаць майстрам! У той год на гэты ж курс прыйшла і Алена Хараберуш з Вільнюса – прыехала паступаць на радзіму маці.
– Нам пашанцавала: курс быў добры, дружны. Вялікі – ажно шэсць чалавек: пяць хлопцаў і я. Рабяты падабраліся рознага ўзросту, жыццёвага вопыту, узроўню падрыхтоўкі, – расказвае Алена Аляксееўна. – Нехта, як Лёша, адразу пасля школы. Нехта пасля мастацкага вучылішча ці арміі. Тым не менш, мы сябравалі, падтрымлівалі адзін аднаго. І выкладчыкі… Нас вучылі не толькі скульптуры, кампазіцыі – прывівалі мастацкі густ. А гэтаму ж на лекцыях не навучыш… Вадзілі на цікавыя фільмы, давалі чытаць добрыя кнігі. Імкнуліся, каб мы развіваліся ўсебакова.
Як і калі паміж імі прабегла лёсавызначальная іскра? У майстэрні, кінатэатры, бібліятэцы, інтэрнаце? Тут ужо абодва паціскаюць плячыма: а хто яго ведае. Даўно тое было… Усё жыццё, са студэнцкай лаўкі і да сённяшніх сівых валасоў, яны разам – дома, у майстэрні, на адпачынку. Часта на іх скульптурах стаіць двайное аўтарства: Леанард Пакульніцкі і Алена Хараберуш. Але калі нават фармальна аўтарам работы з'яўляецца адзін з іх, там нябачна прысутнічае і другі: яго парады, падказкі, фізічная дапамога, бо скульптура – праца цяжкая не толькі ў творчым і інтэлектуальным планах, але і ў фізічным.

## **Творчасць і работа**

З тэатральна-мастацкага інстытута яны выпусціліся з дыпломамі скульптараў і працоўнай кніжкай на руках. Вольныя мастакі! Ваяй, што душа пажадае!
Першай значнай самастойнай работай Леанарда Пакульніцкага стала 5-мятровая фігура салдата ў пасёлку Дрыбін Магілёўскай вобласці – помнік загінулым у вайну землякам. Потым былі іншыя, шмат, у сааўтарстве з Аленай і самастойныя.

Але ў скульптара работа асаблівая… Пісьменнік можа пісаць, нават ведаючы, што не надрукуюць, «у стол», у спадзяванні, што некалі, мо, праз гады і дзесяцігоддзі, нехта прачытае – і ацэніць.
І жывапісец намалюе тое, чым трымціць душа, – і выстаўляе карціну на продаж у мастацкім салоне ці проста на вуліцы, здараецца, што купляюць.



*Скульптура ўзлятаючых буслоў з'яўляецца цэнтральнай часткай кампазіцыі фантана на плошчы Незалежнасці ў Мінску*

Скульптар жа не мае магчымасці адліць з металу ці высечы з каменя шматметровую фігуру і паставіць у майстэрні ці на вуліцы ў спадзеве, што некалі нехта гэта ўбачыць і набудзе. У манументальнай скульптуры павінен быць заказчык, які растлумачыць майстру, што ён хоча бачыць і для чаго. А той прапануе эскіз, у якім ўвасабляе пажаданні і сваё творчае бачанне. Але калі нават заказчыку спадабаецца прапанова скульптара, то ёсць яшчэ мастацкі савет, які вырашае, ці насамрэч яна ўяўляе каштоўнасць. Яе ж убачаць сотні, тысячы людзей! Здараецца, аб’яўляецца конкурс – і журы вызначае, хто з майстроў найлепш зможа ўвасобіць прапанаваную тэму і ідэю. Да таго ж мастацкая каштоўнасць скульптуры заключаецца не толькі ў ёй – вялікае значэнне мае, дзе яна будзе ўстаноўлена, як упішацца ў навакольны ландшафт, таму скульптары заўсёды працуюць у кантакце з архітэктарамі. І ўсе – жывыя людзі, найчасцей – таленты, кожны са сваім светапоглядам, амбіцыямі…
І ад атрымання заказа, адабрэння эскіза мастацкім саветам, перамогі ў конкурсе да моманту, калі з манументальнай фігуры ганаровыя госці здымуць сімвалічны покрыў, праходзяць месяцы, а то і гады напружанай працы. А часам здараецца, што амаль гатовы твор – бяссонныя ночы, сумненні, знаходкі, творчыя азарэнні, цяжкая фізічная работа – застаецца незапатрабаваны: грошы ў заказчыка скончыліся ці ўмяшаліся іншыя

абставіны непераадольнай сілы. Да прыкладу, у гады перабудовы невядомыя скралі іх ужо адлітую ў бронзе вялікую скульптурную кампазіцыю для аднаго з саўгасаў-мільянераў, у якую былі ўкладзены не толькі час і сродкі, але і душа. Што пры гэтым адчувае аўтар? А вы ўявіце, што вынасілі, нарадзілі ў пакутах дзіцятка, расцілі яго, пеставалі, марылі пра яго шчаслівую будучыню – і яго раптам не стала…

– Асабліва цяжка было ў 90-я, – гаворыць Алена Аляксееўна. – Каму патрэбна скульптура, калі людзям есці няма чаго? Цяжка было нават арэнду за майстэрню заплаціць. Браліся за любыя заказы, нават драбязу. Добра, што Лёша ў рамках пазашкольнай адукацыі выкладаў скульптуру, разьбу па дрэве. У той час многія сышлі з прафесіі, а некаторыя, як Віктар Александровіч, – і з жыцця…

Тым не менш, і ў той час, і пасля Леанард і Алена зрабілі шмат скульптурных кампазіцый, якімі могуць ганарыцца і яны, аўтары, і мы, землякі. У магілёўскім кафедральным саборы знаходзіцца іх драўляная скульптура Язафата Кунцэвіча. Каму давядзецца ў Крыме патрапіць на завод шампанскіх вінаў і пабачыць там фігуру Бахуса, ведайце: зрабіў яе Леанард Пакульніцкі. У Нацыянальным алімпійскім камітэце Беларусі знаходзіцца скульптурная кампазіцыя «Бег» яго работы. Каля Кальварыйскіх могілак у Мінску ўражвае помнік ахвярам мінскага гета скульптараў Пакульніцкага і Хараберуш.

І вельмі шкада, што ў доўгім спісе гарадоў і вёсак Беларусі і замежжа, дзе можна ўбачыць работы астравецкага скульптара Леанарда Пакульніцкага, амаль што няма паселішчаў малой радзімы. Адзінае выключэнне – барэльеф Маці Божай Вострабрамскай, які зямляк у 2000 годзе падарыў касцёлу Узнясення Святога Крыжа ў Астраўцы.

Цяпер Пакульніцкія супрацоўнічаюць з Акадэміяй навук Беларусі. Пры ўваходзе на тэрыторыю акадэміі ўстаноўлены скульптуры вучоных, сталага і маладога, якія аб нечым зацікаўлена размаўляюць. Кампазіцыя з сімвалічнай назвай «Пераемнасць беларускай навукі» – аўтарская работа Леанарда Іосіфавіча і Алены Аляксееўны.

Больш за год яны працавалі над «Залатым колам беларускай навукі»: сем фігур вучоных розных пакаленняў паўсталі вакол альтанкі-ратонды.



***Кампазіцыя***

*«Пераемнасць беларускай навукі»  каля Акадэміі навук Беларусі*

– Фігуры вучоных сімвалічныя, тым не менш у кожнай ёсць свой прататып. І трэба было пералапаціць горы літаратуры, каб даведацца пра той час, уявіць, як жыў і чым займаўся даследчык, перадаць у скульптуры не толькі адзенне, паставу, але і характар, пачуцці, думкі, – гаворыць Алена Аляксееўна.

– І так пры кожнай рабоце. Гэта няпроста – але вельмі цікава, – дадае Леанард Іосіфавіч.

– Здараецца, першапачаткова ўзнікне адна ідэя, а потым круціш яе ў думках – і ноччу прысніцца зусім іншае рашэнне. І разумееш: вось яно, сапраўднае!

Такі ўжо лёс у творцы: героі і работы не пакідаюць яго і падчас адпачынку, нават калі рукі заняты нечым іншым, то галава ўсё роўна працуе над вобразам. Калі ўдаецца вызваліць хаця б рукі, Пакульніцкія прыязджаюць на Астравеччыну: тут, па іх прызнанні, лёгка дыхаецца і думаецца. Родны дом у Едакланях ужо апусцеў, і цяпер яны знаходзяць прытулак у гасціннага сябра дзяцінства Леанарда фермера Часлава Лабачэўскага. А заслужаны адпачынак, пра які многія мараць, – гэта не пра іх: творцы і працаголікі на пенсію не выходзяць.

https://www.ostrovets.by/news/novosti/news37292.html